# Паліталогія
# Сацыялогія

Н. М. БЕЛЯКОВІЧ

## САЦЫЯЛЬНЫЯ АДНОСІНЫ: СУТНАСЦЬ І СТРУКТУРА

У сучаснай сацыялагічнай літаратуры паняцце «сацыяльныя адносіны» часцей за ўсё ўжываецца ў трох сэнсах: як сінонім словазлучэння «грамадскія адносіны»; у карытатыўным сэнсе, гэта значыць, у сэнсе сацыяльнай абароны чалавека, сістэмы сацыяльнага забеспячэння; як зборнае паняцце для характарыстыкі практычна ўсіх існуючых адносін паміж людзьмі. Між тым строга навуковага тлумачэння паняццяў «сацыяльнае», «сацыяльныя адносіны» нельга знайсці ні ў сацыялагічным, ні ў філасофскім слоўніку. У навуковай літаратуры, як справядліва падмячае расейскі навуковец В. П. Бех, няма пакуль устойлівага погляду на загадкавае паняцце «сацыяльнае»[1]. Тым не менш яно як само сабой зразумелае выкарыстоўваецца ў трактоўках другіх філасофска-сацыялагічных катэгорый. Напэўна, менавіта гэта ўяўнасць, інтуітыўная яснасць таго, што маецца на ўвазе, калі выкарыстоўваюць тэрмін «сацыяльнае», з'яўляецца прычынай адсутнічання да цяперашняга часу ў сацыялагічнай літаратуры метадалагічнай цэласнай канцэпцыі праблемы сацыяльных адносін.

У самым агульным сэнсе сацыяльныя адносіны можна акрэсліць як бесперапынны працэс усеагульнай сувязі суб'ектаў. У гэтай дэфініцыі, папершае, фіксуецца факт прысутнічання суб'ектыўнасці як найпершай умовы ўзнікнення сацыяльных адносін; па-другое, заключаны такія атрыбутыўныя якасці даных адносін, як бесперапыннасць і ўсеагульнасць. Інакш кажучы, «сацыяльнасць» у той ці іншай меры прысутнічае ва ўсіх відах адносін індывіда ў гэтым складаным і шматгранным свеце. Гэта могуць быць як яго непасрэдныя адносіны з другімі людзьмі, так і апасродкаваныя — праз матэрыяльныя і духоўныя прадметы чалавечай дзейнасці. Уключанасць сацыяльнага ва ўсе віды адносін суб'ектаў (нават у адносіны да прыроды ў той меры, у якой яна «ачалавечана» ці «знявечана» чалавекам) складае, як сцвярджаюць даследчыкі, спецыфіку сацыяльных адносін.

Названае агульнае азначэнне сацыяльных адносін можна, у залежнасці ад мэт і задач даследавання, дапоўніць больш канкрэтнымі іх рысамі, сфармуляваўшы тым самым вярбальнае азначэнне. Апошняе выкарыстоўваецца для апісання ўстойлівых сувязей і залежнасцей суб'ектаў, што праяўляюцца ў адпаведных сферах, маштабах і структурна-функцыянальных сістэмах. Напрыклад, для характарыстыкі паводзін індывідаў у прыватна-сацыяльнай сферы жыццядзейнасці грамадства. Пад гэтым відам адносін разумеюцца адносіны паміж сацыяльнымі групамі, вялікімі і малымі, на падставе іх месца і ролі ў грамадстве, спосабу іх жыцця, укладу і стылю паводзін.

Змест сацыяльных адносін адлюстроўвае сукупнасць сувязей і ўзаемаадносін чалавека — як аб'ектыўных, так і суб'ектыўных. Аб'ектыўныя, ці, як іх яшчэ называюць у навуковай літаратуры, структурна-функцыянальныя сувязі, узнікаюць без свядомага імкнення індывідаў да ўстанаўлення акрэсленых адносін, без іх волі і суб'ектыўных намераў. Прыкладам такога тыпу адносін з'яўляюцца прамысловыя адносіны — складаная, аб'ектыўная, незалежная ад індывіда сістэма сувязей, у якую ён уключаецца ў працэсе вытворчасці, заснаванай на грамадскім падзеле працы. Да суб'ектыўных, ці інтэнцыянальных сацыяльных адносін, належаць адносіны, якія ўстанаўліваюцца паміж суб'ектамі ў адпаведнасці з іх воляй,

свядома акрэсленым жаданнем, на аснове агульных інтарэсаў, установак, каштоўных арыентацый і г. д. Да іх можна далучыць адносіны дружбы, партнёрства і супрацоўніцтва, сумесныя дзеянні суб'ектаў у барацьбе за ўладу і інш.

Важна падкрэсліць, што мера асэнсаванасці і нарміроўкі асобных суб'ектыўных сувязей індывідаў з'яўляецца якаснай характарыстыкай сацыяльных адносін. Выразнасць, канкрэтнасць і рэалістычнасць агульных мэт і задач з'яўляюцца тым сутнасным фактарам, які гарантуе стабільнасць, дынамізм і значныя вынікі дзеянняў сацыяльных структур і аб'яднанняў. Выкананне кожным індывідам нармалізаваных праграм, узаемных абавязкаў і прававых норм гарантуюць захаванне ўнутранай арганізацыі і высокую эфектыўнасць функцыяніравання сацыяльных адносін.

Ва ўмовах крызісу і нестабільнасці, што ахапілі ўсе структуры грамадства, у змесце сацыяльных адносін побач з унармаванасцю і легітымнасцю на пярэдні план выходзяць, па меншай меры, яшчэ тры аспекты, патрабуючыя пільнай увагі з боку даследчыкаў. Першы — эмацыянальна-інтуітыўны, асабліва абвостраны цяпер ва ўсіх відах сацыяльных адносін. Эмацыянальна-інтуітыўны фактар можа выступаць у ролі магутнай пабуджальнай сілы актыўных, нават творчых дзеянняў людзей. І наадварот, ён здольны парушыць многія самыя прадуманыя рацыянальныя рашэнні і чаканні. Навука не можа не прымаць да ўвагі і не даследаваць гэты слаба кантралюемы бок чалавечых паводзін, розныя станы індывідуальнай, групавой і грамадскай свядомасці, псіхалагічную наяўнасць жыцця індывіда.

Другі актуальны аспект сацыяльных адносін — прагназіраванне і рэгуляванне грамадскіх працэсаў. Якаснае пераўтварэнне ўсіх сфер жыццядзейнасці грамадства заключаецца, як паказвае практыка, у проціборстве дзвюх ясна выражаных тэндэнцый — захавання існуючых парадкаў і змянення састарэлай сістэмы адносін. Пераважнай сярод іх у рэшце рэшт аказваецца тэндэнцыя да змянення, спароджаная творчай актыўнасцю і свабоднай воляй чалавека. Адначасова яна пашырае межы нявызначанасці і арыентуе чалавека на дасягненне новага. Прагназіраванае сацыяльнае мысленне па сутнасці вызначае ўвесь спектр адпаведных дзеянняў суб'ектаў. Гэтае бачанне будучага зусім не абавязкова павінна адбывацца ў якіх-небудзь відавочных, рэальных карцінах. Праблема заключаецца ў тым, каб у сённяшніх сацыяльных калізіях адчуць тыя глыбінныя тэндэнцыі, якія ўздзейнічаюць на агульны ход і напрамак сацыяльнага прагрэсу. Арыентацыя на будучае адлюстроўвае сучасныя сацыяльныя дзеянні ў выглядзе ідэала, гэта значыць, больш дасканалай мадэлі грамадства, да якой трэба імкнуцца.

Трэці, цесна звязаны з папярэднім, аспект сацыяльных адносін — каштоўнасныя арыентацыі індывідаў. Чалавек паводзіць сябе ў адпаведнасці са сваім складам мыслення, каштоўнымі ўяўленнямі. Ён выстаўляе тыя ці іншыя патрабаванні з пазіцый свайго разумення справядлівасці ці несправядлівасці. Каштоўнасці выконваюць функцыю ўзбагачэння і ўзвышэння чалавечага жыцця, абгрунтавання духоўнай культуры. Абсалютная абыякавасць чалавека да каштоўнасцей, іх пошуку і асэнсаванню азначае дэградацыю, распад і выраджэнне нацыі, роду людскога.

Сказанае дазваляе сцвярджаць, што сацыяльныя адносіны прадстаўляюць сабой адпаведным вобразам структураваную сістэму. У якасці структураскладаючых асноў іх можна вызначыць, па-першае, супольнасць прадметных сувязей індывідаў з акаляючым асяроддзем; па-другое, разнастайнасць патрэбнасцей і інтарэсаў людзей, задавальненне якіх вымушае іх узаемадзейнічаць; па-трэцяе, узаемаабумоўленасць і ўзаемазалежнасць суб'ектаў у працэсе жыццядзейнасці. У адпаведнасці з вызначанымі падставамі ў структуры сацыяльных адносін можна выдзеліць наступныя элементы: узаемасувязі, узаемадзеянні і ўзаемазалежнасці. Узаемасувязі — гэта адпаведным чынам арганізаваная сістэма адносін, інстытутаў і сродкаў сацыяльнага кантролю, якая аб'ядноўвае індывідаў, падгрупы і іншыя састаўныя элементы ў функцыянальнае цэлае, здатнае самазахоўвацца і развівацца. Грамадскае жыццё пачынаецца менавіта тады, калі людзі, каб задаволіць свае патрэбнасці, пачынаюць вытворчасць матэрыяльных даброт, уступаюць у кантакты і ўстойлівыя сувязі, калі складваецца раздзяленне працы і абмен яе вынікамі. Таму любая група, калі яна жадае існаваць, павінна валодаць чымсці, што ўмацоўвае яе знутры, што дэтэрмінуе супрацоўніцтва яе членаў, забяспечвае задавальненне патрэб у яе рамках, дазваляе ёй умацоўвацца і развівацца. Адным словам, любая група і любая супольнасць павінна валодаць сваёй унутранай сувяззю.

Узаемадзеянне як элемент структуры сацыяльных адносін накіравана на змяненне і развіццё існуючай сістэмы, паводзін, установак, імкненняў індывідаў і суполак. Сацыяльныя дзеянні, у адрозненне ад сувязей, прадугледжваюць выбар адпаведных сродкаў і метадаў, пры дапамозе якіх індывід ці група намерваюцца змяніць паводзіны, устаноўкі, меркаванні іншых асоб альбо груп. Сацыяльная ўзаемазалежнасць узнікае паміж людзьмі аднаго грамадства альбо аб'ектыўна, незалежна ад іх волі і свядомасці, альбо выцякае са свядомых уздзеянняў аднаго з іх на другога. Інакш кажучы, у першым выпадку гутарка ідзе аб структурна-функцыянальнай залежнасці суб'ектаў, якія дзейнічаюць у рамках адной структуры; у другім выпадку — аб залежнасці інтэнцыяльнай, што складваецца ў працэсе непасрэдных намераў індывідаў.

У залежнасці ад характару і зместу сувязей індывідаў з аб'ектыўным мірам і паміж сабой можна выдзеліць розныя формы сацыяльных адносін. Гэта, перш за ўсё, сацыяльна-эканамічныя, да якіх належаць усе адносіны, звязаныя з вытворчасцю, размеркаваннем і спажываннем даброт і паслуг, рэгуляваннем грашовага абарачэння, арганізацыяй і падзелам працы. Апошнія фарміруюцца на гістарычна і традыцыйна складзеным матэрыяльным базісе канкрэтнага грамадства. Далей, сацыяльна-палітычныя адносіны, альбо адносіны, звязаныя з устанаўленнем, выкарыстоўваннем і падтрымкай улады ў грамадстве. Да іх адносяцца таксама дзеянні, звязаныя з функцыяніраваннем і ўзнаўленнем палітычных сістэм, з іх гістарычным развіццём, патрэбнасцямі — карацей, з усім, што так ці інакш можа зрабіць уплыў на грамадства ў цэлым. У той меры, у якой асобныя людзі ўключаюцца ў адпаведныя палітычныя аб'яднанні, ці гэта горад-дзяржава ў Старажытнай Грэцыі, сярэдневяковы феод, сучасная нацыянальная дзяржава і г. д., яны маюць агульную сферу інтарэсаў і заняткаў, фармулююць суджэнні аб інстытутах, намячаюць рэформы, абмяркоўваюць розныя метады іх правядзення, ажыццяўляюць уплыў на ўладарную сістэму ці падпарадкоўваюцца ёй. Вось чаму палітычныя адносіны людзі называюць грамадскімі. Кожны чалавек, які валодае большай ці меншай інфармацыяй, разглядае палітычную суполку як цэлае, часткай якой ён з'яўляецца, часткова ці цалкам ідэнтыфіцыруе сябе з ёй, ці адмяжоўваецца ад яе. У кожным выпадку тут мае месца вымярэнне сацыяльнага жыцця, якое ўплывае на прыватнае жыццё чалавека, але не перабльтваецца з ім. Менавіта ў гэтым вымярэнні адбываецца ўзаемадзеянне палітычных суб'ектаў, кіруючай эліты і мас[2].

Сацыяльна-культурныя адносіны складваюцца ў працэсе засваення людзьмі культурных каштоўнасцей грамадства. Адносіны ўласна сацыяльныя, як мы ўжо адзначылі вышэй, з'яўляюцца адносінамі паміж вялікімі і малымі сацыяльнымі групамі і суполкамі. Інстытуцыянальныя адносіны фіксуюць дачыненне суб'ектаў да канстытуцыі дзяржавы, законаў, сацыяльных інстытутаў і арганізацый, правапарадку, традыцый і г. д. Рэлігійныя адносіны адлюстроўваюць стасункі людзей да сіл звышнатуральных, дзейнічаючых па-за эмпірычным кантролем чалавека.

[1] Гл.: Б е х В. П. // Социол. исследования. 1992. № 1. С. 157.

[2]. Гл.: С а н и с т е б а н Л. С. Основы политической науки / Пер. с исп. М., 1992. С. 17.